# СІНОНІМЫ Ў ТВОРАХ І.П. ШАМЯКІНА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

***Т.І. Несцярчук*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – В.Я. Барысенка, канд. філал. навук, дацэнт

І.П. Шамякін пісаў свае творы для дзяцей рознага школьнага ўзросту. І калі прааналізаваць апавяданні, прысвечанныя малодшым школьнікам, то можна адзначыць, што яны адрозніваюцца ад тых, што напісаны для старэйшага школьнага ўзросту. Падбіраючы пэўны сінонім, пісьменнік імкнецца выкарыстаць такі, каб ён быў зразумелым.

Большасць сінонімаў стылістычныя. Так да дзеяслова ***гаварыць,*** які ў стылістычных адносінах нейтральны, пісьменнік падбірае шэраг сінонімаў: *Бацька* ***смяяўся:*** *«Дзе ты ёй ляскаць будзеш, пугай той?»* [1, с. 257]; *А што ён* ***буркнуў*** *як бы злосна, незадаваленна: «Падумаю»* [2, с. 277]; *«Не хвалюйся, пахаваюць», –* ***казала*** *яна.* ***Не гавары*** *ты пра гэта. «Што ты* ***плявузгаеш,*** *дурная?»; Раней збіраліся за сталом і, як правіла,* ***вялі*** *доўгую* ***гаворку*** *на самыя розныя тэмы – ад высокай палітыкі да цэпаў, што скакалі галопам. Ён параіў не* ***малоць языком*** [3, с. 100–103]. Такім чынам, нейтральны дзеяслоў ***гаварыць*** з'яўляецца дамінантай у сінанімічным радзе з размоўнымі *буркаць, плявузгаць, шчабятаць, казаць*, з высокім стылем *весці гаворку*, з грубым фразеалагізмам *малоць языком.*

Сустракаюцца ў творах І.П. Шамякіна і эўфенізмы. Трэба адзначыць тое, што часта яны сустракаюцца ў апавяданнях, напісаных для маленькіх. Гэта тлумачыцца эмацыйным уздзеяннем такіх слоў на дзяцей і робіць твор больш цікавым і займальным для іх: *«Дыяметр першай трубы…» – і, хапаючыся за дошку,* ***страціла прытомнасць.*** *Ніна Паўлаўна не адразу ўбачыла, што любіміца яе* ***самлела*** *каля дошкі* [1, с. 261]; *Як гэта* ***«распатронілі»?»*** *– нахмурыўся Павел. «Ну, як?* ***Расстралялі…»*** [4, с. 22]

Сярод сінонімаў, якія сустракаюцца пры аналізе твораў, ёсць словы розных часцін мовы: *ежа – прысмакі* [3, с. 126], *немцы – паганцы* [5, с. 9]; *спрытны – паваротлісты* [6, с. 165], але найбольш пашырана ўжыванне сінонімаў-дзеясловаў. Асабліва выразнай экспрэсіяй валодаюць сінонімы-дзеясловы: ужываючы іх у мове персанажаў, аўтар дае ім поўную характарыстыку, паказвае ўнутраны стан герояў: *Маці* ***заплакала*** *і больш не сказала ні слова. Маці, убачыўшы яго, уздрыгнула і зноў* ***праслязілася*** [4, с. 13]; *З дзіцячым эгаізмам* ***эксплуатавала*** *яго.* ***Прымушала*** *чытаць гадзінамі, а ў старога ад гэтага чытання ўголас балела галава*[3, с. 102]. Дзеяслоўная сінанімія ставарае паступовы ход падзей, паказвае ўсебаковае апісанне дзеяння, таму творы дынамічныя і цікавыя для чытачоў.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што за кошт сінонімаў ствараюцца яркія вобразы, тонка апісваюцца пейзажныя замалёўкі, адчувальна перадаецца ўнутраны стан герояў.

**Літаратура**

1. Вось якія мы : вершы, байкі, казкі, апавяданні беларускіх пісьменнікаў пра дзяцей : для мал. шк. узросту / уклад. І.М. Страмок ; маст. І.М. Лобан. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 272 с.
2. Шамякін, І.П. Бацькі і дзеці. Выбранае. Апавяданні / І.П. Шамякін. – Мінск : Беларусь, 1971. – 480 с.
3. Шамякін, І.П. Пошукі прытулку : аповесці : для ст. шк. узросту / І.П. Шамякін ; маст. У. М. Аніська. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 301 с.
4. Шамякін, І.П. Апавяданні : дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва БССР / І.П. Шамякін. – Мінск, 1952. – 161 с.
5. Шамякін, І.П. Глыбокая плынь : раман : для сярэд. і ст. шк. узросту / І.П. Шамякін ; прадм. А. Марціновіча. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 286 с.
6. Шамякін, І.П. У засені палаца : аповесці : для ст. шк. узросту / І.П. Шамякін; маст. У.М. Аніська. – Мінск : Юнацтва, 2001 – 350 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина